Весці БДПУ. Серыя 2. 2023. № 2. С. 109–113

УДК 327 (476:4-470)”1921/1930”

# РОЛЯ ВЫСТАВАЧНА-КІРМАШОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РАЗВІЦЦІ ГАНДЛЮ ПАМІЖ БССР І ПОЛЬШЧАЙ У 1921–1930 гг.

**В. М. Бароўская,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*старшы навуковы супрацоўнік*
*Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

UDC 327 (476:4-470)”1921/1930”

# THE ROLE OF EXHIBITION-TRADING ACTIVITY IN DEVELOPMENT OF TRADE BETWEEN BSSR AND POLAND IN 1921–1930

**O. Borovskaya,**
*PhD in History, Senior Researcher*
*of the Institute of History, National*
*Academy of Sciences of Belarus*

Паступіў у рэдакцыю 08.02.23.

Received on 08.02.23.

У артыкуле звяртаецца ўвага на выставачна-кірмашовую дзейнасць Упраўлення Народнага камісарыята знешняга гандлю РСФСР пры СНК БССР у 1921–1930 гг., на яе ролю ва ўмацаванні і пашырэнні знешнеэканамічных адносін з Польшчай. Непаспяховасць савецка-польскіх гандлёвых перагавораў і як вынік адсутнасць трывалай дагаварной базы прыводзілі да неабходнасці пошуку альтэрнатыўных шляхоў па стварэнні эфектыўнай сістэмы тавараабароту паміж бакамі. Падкрэсліваецца, што ўдзел Упраўлення ўпаўнаважанага НКЗГ РСФСР (СССР) пры СНК БССР у розных выставах і міжнародных кірмашах садзейнічаў умацаванню беларускіх эканамічных пазіцый, быў спосабам азнаямлення шырокіх слаёў насельніцтва з новымі таварамі і паслугамі, забяспечваў збыт прадукцыі на мясцовым і замежных рынках шляхам заключэння дагавораў. Асноўная ўвага засяроджваецца на працы Ліонскага кірмашу, «Усходніх таргоў» ў Львове, «Заходніх таргоў» у Познані, Ніжагародскага кірмашу, выставах: Усерасійская сельскагаспадарчая і кустарна-прамысловая, Усебеларуская сельскагаспадарчая, што садзейнічала павелічэнню аб'ёму экспертна-імпартых аперацый, умацоўвала міжнародны аўтарытэт маладой савецкай рэспублікі.

*Ключавыя словы*: выставачна-кірмашовая дзейнасць, экспартна-імпартныя аперацыі, транзіт, тавараабмен.

The article draws attention to exhibition-trading activity of Department of the People's Commissariat of Foreign Trade of RSFSR under the SNK of the BSSR in 192101930, its role in strengthening and broadening of foreign economic relations with Poland. Failure of Soviet-Polish trading negotiations and as a result absence of long-lasting negotiation base led to the necessity of searching alternative ways to create the effective system of goods exchange between the parties. It is emphasized that participation of Office of the Commissioner of the National Committee of RSFSR (USSR) under the SNK of the BSSR in various exhibitions and international markets contributed to strengthening of Belarusian economic positions, was a way to familiarize the broader population with new goods and services, provided production distribution in domestic and foreign markets by concluding contracts. The main attention is focused on the work of Lionsky market, Eastern Trades in Lvov, Western Trades in Poznan, Nizhegorodsky market, exhibitions: All-Russian agriculturalб artisanal and industrial one, All-Belarusian agricultural one, which contributed to increasing volume of export and import transaction, strengthening international authority of the young Soviet republic.

*Keywords:* exhibition-trading activity, export and import transactions, transit, goods exchange.

*Уводзіны.* Рыжскі мірны дагавор быў сродкам пацыфікацыі ўсходнееўрапейскага рэгіёна, фінальнай кропкай ваенных дзеянняў, якія спустошалі беларускія землі напрацягу амаль васьмі гадоў. Дагавор залажыў асновы мірнага будаўніцтва і развіцця тэрыторыі Беларусі. Згодна з гэтым дыпламатычным дакументам адбылося афіцыйнае прызнанне ў якасці самастойных суб’ектаў міжнароднага права БССР і УССР, намеціліся шляхі вырашэння многіх спрэчных пытанняў, у тым ліку і заключэнне гандлёвага дагавора і шляхі пабудовы эфектыўнага эканамічнага супрацоўніцтва.

У гістарыяграфіі пытанне ўзаемаадносін БССР і Польшчы не станавілася самастойным аб’ектам даследаванняў. Першапачатковае асмысленне тэмы адбываецца ў рамках публіцыстычных артыкулаў (І. Адамайціс [1], І. Тэумін [2]) і на старонках штогадовых аглядаў дзейнасці Упраўлення ўпаўнаважанага Народнага камісара знешняга гандлю (НКЗГ) РСФСР пры СНК БССР [3]. У савецкай гістарыяграфіі варта вылучыць дысертацыю П. К. Краўчанкі [4], які абыходзіць сваёй увагай выставачна-кірмашовую дзейнасць. Сучасная расійская і беларуская гістарыяграфія адзначана распрацоўкамі А. В. Барыкіна [5] і Д. У. Раманоўскага [6]. Адсутнасць прац, прысвечаных непасрэдна вывучэнню знешнеэканамічных адносін БССР і Польшчы міжваеннага перыяду, наяўнасць дастатковай крыніцавай базы павышае актуальнасць прадстаўленай праблемы.

*Асноўная частка.* Згодна з артыкулам XXI Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г., РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшча – з другога, павінны былі не пазней чым праз шэсць месяцаў з моманту ратыфікацыі дагавора пачаць перагаворы па заключэнні спецыяльнага Гандлёвага дагавора і дагавора аб кампенсацыйным тавараабмене. Артыкул XXII дагавора абавязваў

бакі да моманту заключэння вышэй пералічаных міжнародных дакументаў арганізаваць бесперашкодны транзіт тавараў «па ўсім чыгуначных, водных шляхах, вольных для транзіту» [7, с. 640–641]. У пачатку жніўня 1921 г. савецкі ўрад накіраваў у Польшчу дэлегацыю, каб пачаць перагаворы аб заключэнні гандлёвай дамовы згодна з арт. XXI Рыжскага дагавора. У выніку ў Варшаве былі створаны гандлёвыя прадстаўніцтвы РСФСР і УССР. Гандлёвыя адносіны пачалі развівацца толькі з пачатку 1922 г., пасля ліквідацыі польска-савецкага палітычнага канфлікту канца верасня – пачатку кастрычніка 1921 г. У лютым-сакавіку 1922 г. Гандлёвае прадстаўніцтва РСФСР у Варшаве заключыла шэраг здзелак з польскімі фірмамі (акцыянернымі таварыствамі «Шайблер і Громан» у Лодзі, Міркаўскай папяровай фабрыкай, таварыствам «Механічных заводаў Фіцнера і Гампера»).

Усталяванне якасных гандлёвых адносін з'яўлялася надзённым пытаннем для абодвух бакоў. Праз Польшчу праходзіла большасць гандлёвых шляхоў, якія вялі на Захад. Гэтая краіна з'яўлялася буйным суседам савецкіх рэспублік: працягласць пагранічнай лініі з ёй складала каля 1400 кіламетраў. Тым больш доўгачасовае знаходжанне часткі польскіх зямель у складзе Расійскай імперыі моцным чынам звязала эканоміку гэтых краін. Аднак, па даным Народнага камісарыята знешняга гандлю, імпарт з Польшчы ў Савецкую Расію за дзевяць месяцаў 1921 г. склаў 486 тыс. руб., што складала ўсяго 0,2 % ад усяго імпарту Савецкай дзяржавы. Экспарт за адзначаны перыяд часу налічваў толькі 24 тыс. руб. [8, арк. 15].

Актывізацыя знешнеэканамічнай дзейнасці з'яўлялася карысным як для польскага, так і беларускага боку. Важным сродкам умацавання пазіцыі на рынку была выставачна-кірмашовая дзейнасць. Самымі папулярнымі выставачнымі мерапрыемствамі была кірмашы (таргі). Яны выконвалі тры важныя функцыі: забяспечвалі патрэбы прадпрыемстваў у прадстаўленні прадукцыі, садзейнічалі ўмацаванню пазіцый ва ўмовах рыначнай канкурэнцыі, былі спосабам азнаямлення шырокіх слаёў насельніцтва з новымі таварамі і паслугамі. Асноўная мэта міжнародных кірмашоў – збыт прадукцыі на мясцовым і замежных рынках шляхам заключэння дагавораў.

У першай трэці XX ст. кірмашы арганізоўваліся ў многіх краінах свету. Міжнародныя таргі адбываліся ў Франкфурце-на-Майне, Будапешце, Барселоне, Лейпцыгу, Ліоне і іншых еўрапейскіх гарадах. Прадстаўнікі БССР прымалі ўдзел у працы ў Лінскім вясновым кірмашы 1923 г. Для экспаніравання былі адабраны «ўзоры адпаведнай якасці, тавары, якія могуць садзейнічаць прыцягненню замежных капіталаў для іх вытворчасці» [9, арк. 1]. Упаўнаважаны Упраўлення Народнага камісарыята знешняга гандлю РФСР пры СНК БССР А. Ф. Ульянаў падкрэсліваў, што на кірмаш «пажадана вывесці тавары, якія маюць асобы мясцовы, нацыянальны адбітак, розныя вырабы кустарна-прамысловай вытворчасці, напрыклад Слуцкія паясы».

У 1921 г. у Львове ўпершыню прайшла агульнапольская выстава-кірмаш «Усходнія таргі». Яны арганізоўваліся на дзяржаўным узроўні з мэтай наладжвання гандлёвых сувязей з краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Для Міністэрства прамысловасці і гандлю Польшчы гэты міжнародны кірмаш быў адным з важных фактараў гаспадарчай палітыкі Польшчы, якая выконвала ролю пасрэдніка паміж Заходняй і Усходняй Еўропай, прапагандаваць польскую эканоміку, сфарміраваць адзіную гаспадарчую сістэму. У львоўскіх «Усходніх таргах» прымала ўдзел перважная большасць еўрапейскіх дзяржаў, што садзейнічала развіццю знешняга гандлю. У кірмашы 1921 г. прымалі ўдзел 1852 фірмы, з іх – 244 замежныя. У 1925 г. у міжнародным кірмашы ўдзельнічала ўжо 1500 прадпрыемстваў, з іх 350 – замежныя [10, s. 15]. Найбольшай папулярнасцю на львоўскіх таргах карысталіся імпартныя тавары: аўтамабілі з Аўстрыі, Францыі, Германіі; тэлефоны, галантарэйныя вырабы, медыцынская тэхніка, аптычнае абсталяванне з Аўстрыі і Германіі.

Гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Польшчы 15 жніўня 1923 г. паведамляла Упраўленне ўпаўнаважанага НКЗГ РСФСР пры СНК БССР аб адкрыцці штогадовых «Усходніх таргоў» (Львоў) 5 верасня 1923 г. На гэта мерапрыемства былі запрошаны і прадстаўнікі Гандлёвага прадстаўніцтва. Так як на кірмашы мелі сваё прадстаўніцтва многія польскія прамысловыя прадпрыемствы, гэта стала добрай зачэпкай для пашырэння і ўмацавання імпартных аперацый. Асаблівая цікавасць беларускага гандлёвага кіраўніцтва меў парафін, які праз Польшчу накіроўваўся ў Францыю, што амаль ліквідавала магчымасць яго закупкі. У лісце падкрэслівалася, што «наша выступленне на Львоўскім кірмашы ў якасці пакупнікоў мае не толькі дзелавое, але і палітычнае значэнне, якое палегчыць нам умовы працы ў Польшчы» [11, арк. 332].

У справаздачы ўпаўнаважанага Упраўлення НКЗГ СССР пры СНК БССР падкрэслівалася, што асноўная мэта правядзення Львоўскага кірмашу з'яўляецца «зацікаўленнасць польскага боку ў выкарыстанні свайго міжнароднага становішча ў інтарэсах непасрэднага авалодвання тым патокам, па якому прасоўваюцца тавары з фабрычна-заводскага Захаду на беставарны Усход» [11, арк. 461]. Упершыню на кірмашы была прадстаўлена цяжкая прамысловасць Верхняй Сілезіі і гандлёва-прамысловыя фірмы Данцыгу. Польская прамысловасць была прадстаўлена сельскагаспадарчымі машынамі, механічнымі вырабамі, жалезнымі вырабамі, прадметамі тэхнічнай і электратэхнічнай вытворчасці, прадуктамі нафтавай і вугальнай прамысловасці, ткацкай прамысловасці, шклянымі вырабамі, галантарэяй, прынадлежнасцямі для млыну, лясной вытворчасцю, агародніцтвам, будаўнічай справай, гарбарнай справай, вырабамі з дрэва, аўтамабільнай, матацыклетнай, керамічнай вытворчас-

цю, хатнімі вырабамі, папяровымі вырабамі, канцылярскімі вырабамі, ювелірнымі, музычнымі, прадметамі спорту, хіміка-фармацэўтычнымі, водачнымі вырабамі і інш. Акрамя польскай прамысловасці на кірмашы прысутнічалі прадстаўнікі Францыі, Чэхаславакіі, Аўстрыі і Венгрыі.

У цэлым кірмаш праходзіў пад знакам цеснага эканамічнага супрацоўніцтва Польшчы з Усходам, галоўным чынам, з Украінай і Расіяй. Гэта было падкрэслена ў заявах прэзідэнта Львоўскага магістрата, прадстаўнікоў камітэту кірмашу і польскай эканамічнай прэсай, якія адзначалі, што «Савецкая Федэрацыя з яе прыроднымі багаццямі зможа вывезці Польшчу з тых гаспадарчых цяжкасцяў, якія яна зараз перажывае» [11, арк. 466].

Міжнародныя кірмашы ў Львове праходзілі штогод і былі другімі па маштабе пасля «Заходніх таргоў» у Познані. Так, адзначаецца цікавасць з боку беларускага кіраўніцтва да працы сельскагаспадарчай выставы ў Познані 1923 г. (25 чэрвеня – 1 ліпеня). Члены беларускай дэлегацыі заключылі здзелкі на закупку сельскагаспадарчых машын і прылад [11, арк. 48].

На тэрыторыі СССР найбольш вядомым яшчэ з часоў Расійскай імперыі з’яўляўся кірмаш у Ніжнім Ноўгарадзе (1922–1929 гг.). У 1922 г. у яго працы прымалі ўдзел 584 аптовыя фірмы, з якіх 240 былі дзяржаўнымі, 164 – кааператыўнымі, 180 – прыватнымі і 331 рознічная гандлёвая фірма [12, арк. 42]. Аднак доступ замежных прадпрымальнікаў да працы кірмашу быў дастаткова нізкі, хутчэй быў арыентаваны на мясцовыя патрэбы.

Згодна з перапіскай Гандлёвага прадстаўніцтва ў Польшчы і Дзяржгандальбелам у чэрвені 1924 г. адзначаецца, што ў гэта час у Польшчы быў гандлёва-прамысловы застой, што адбілася на працы Ніжагародскага кірмашу. Пры гэтым польскі рынак мае неабходнасць у каракулі, баранніх вырабленых скурах, сушанай садавіне, дыванах, бавоўніне, усходніх хатніх туфлях [11, арк. 54].

У 1920-я і 1930-я гг. у Савецкай Расіі міжнародную складаючую мелі і сельскагаспадарчыя выставы. Па тэрытарыяльный прыкмеце яны дзяліліся на ўнутрыгаспадарчыя, раённыя, абласныя (краявыя), рэспубліканскія і ўсесаюзныя. Найбольш значнай у 1920-я гг. была Першая Усерасійская кустарна-прамысловая выстава, якая адбывалася ў Маскве ў 1923 г. На ёй дасягненні народнай гаспадаркі БССР былі прадстаўлены ў рамках асобнага павільёну.

Згодна з «Палажэннем аб удзеле іназемцаў на Выставе», зацверджаным 26 студзеня 1923 г., быў акрэслены час яе правядзення – з 15 жніўня па 1 кастрычніка 1923 г. Акрамя таго агаворваліся правілы ўдзелу замежных фірм, устаноў і асоб. Усімі зносінамі з іназемнымі гасцямі заведвала Замежнае Бюро Выставы. Іназемцам гарантаваліся ўсе ільготы, якія былі прадстаўлены расійскім экспанентам. Пры гэтым удзел на выставе мог быць нацыянальным (калі дзяржава прымае на сябе арганізацыю свайго аддзела для экспаніравання прадуктаў і вытворчасці сваёй краіны) ці агульным (калі кожны экспанент выступаў самастойна) [13, с. 15].

10 лютага 1923 г. польскае прадстаўніцтва ў Маскве накіравала савецкаму ўраду ноту, у якой прапаноўвалася ўзнавіць перагаворы па заключэнні гандлёвага дагавора. Нота ў адказ 14 лютага прапаноўвала пачаць перагаворы ў Маскве 26 лютага [14, с. 217–218]. Аднак яны так і не пачаліся. 1 сакавіка Г. В. Чычэрын у размове з Р. Кнолем зноў узняў гэтае пытанне. Народны камісар замежных спраў выказаўся за развіццё савецка-польскіх эканамічных зносін, якія будуць садзейнічаць стварэнню нармальнай атмасферы паміж краінамі. Падчас гэтай сустрэчы польскі бок у чарговы раз узняў праблему выканання матэрыяльных абавязкаў па Рыжскім дагаворы.

9 сакавіка 1923 г. пачаліся савецка-польскія гандлёвыя перагаворы. 16 сакавіка Я. С. Ганецкі ў тэлеграме Л. Л. Абаленскаму, паўнамоцнаму прадстаўніку СССР у Польшчы, указваў у якасці галоўнай задачы імкненне да змяншэння памераў выплат па матэрыяльных абавязках [15, арк. 43]. Перагаворы адбываліся ва ўмовах неўрэгуляванасці пытання выканання Рыжскага мірнага дагавора, пры наяўнасці вострых рознагалоссяў адносна наладжвання транзіту праз польскую тэрыторыю і выкарыстання прынцыпу найбольшага спрыяння. Таму ўжо ў пачатку красавіка яны былі прыпынены па прычыне іх безвыніковасці.

Пасля зрыву перагавораў адзначаецца пэўная абвостранасць двухбаковых адносін. Па меркаванні Г. В. Чычэрына, галоўнай падзеяй, якая садзейнічала гэтаму стану, стала забойства ксёндза К. Р. Буткевіча. У выніку склалася такая сітуацыя, што нават ваенныя прыгатаванні СССР уздоўж польскай мяжы не маглі яшчэ больш пагоршыць адносіны паміж дзвюма краінамі [16, арк. 4].

21–26 сакавіка 1923 г. у Маскве адбыўся судовы працэс над 15 каталіцкімі святарамі, абвінавачанымі ў контррэвалюцыйнай дзейнасці ў інтарэсах сусветнай буржуазіі. Я. Ф. Цапляк (1857–1926) быў прыгавораны да смяротнага пакарання, якое пасля было заменена на 10 год пазбаўлення волі. Па гэтай справе быў расстраляны ксёндз К. Р. Буткевіч (1867–1923).

«Справа Буткевіча» паўплывала на той факт, што ў польскай прэсе і грамадска-палітычнай думцы была арганізавана кампанія байкоту Усерасійскай сельскагаспадарчай выставы ў Маскве 1923 г. У выніку НКЗС СССР і Галоўны выставачны камітэт пастанавілі «прызнаць немагчымым удзел Польшчы ў Сельскагасвыставе да спынення той кампаніі супраць СССР, якая ў апошні час вядзецца ў Польшчы і якая не пакінула нават нашу выставу, спрабуючы зрабіць яе арэнай палітычных інтрыг» [17, с. 237].

Да гэтага часу адсутнічалі непасрэдныя ўзаемаадносіны з польскім урадам, у прыватнасці з польскім Міністэрствам гандлю і прамысловасці. Спроба ўсталяваць такія ўзаемаадносіны як Гандлёвым прадстаўніком У. С. Федаравым, так

і С. Г. Гарчаковым былі безвыніковымі. «Несумненна, што лінія паводзін, якая змяняецца ў адносінах да нас польскага ўраду цалкам, выклікае змены ва ўзаемаадносінах з Міністэрствам гандлю і прамысловасці. Гэта было б пажадана ў інтарэсах уладкавання шматлікіх дробязей нашай аператыўнай практыкі ў Польшчы» [18, арк. 15].

Актыўнае дзяржаўнае і эканамічнае будаўніцтва ў 1920-я гг. у Беларусі стымулявалі правядзенне спецыялізаваных выстаў рэгіянальнага маштабу. У другой палове 1920-х гг. у БССР узнікае неабходнасць у правядзенні сельскагаспадарчай выставы рэспубліканскага маштабу. Рашэнне аб правядзенні Першай Усебеларускай сельскагаспадарчай выставы было прынята ЦВК БССР у лістападзе 1927 г. Быў вызначаны час правядзення – лета-восень 1930 г. Яе галоўнай задачай была ўсебаковая дэманстрацыя дасягненняў сельскай гаспадаркі і прамысловасці за 10 год існавання Савецкай Беларусі, дэманстрацыя прыродных багаццяў, азнаямленне з вынікамі сацыялістычнага будаўніцтва як грамадзян БССР, так і гасцей з іншых саюзных рэспублік і замежных краін, абмен вопытам і ўсталяванне гаспадарчых сувязей з іншымі рэспублікамі, ажыццяўленне маштабнай асветнай, агітацыйна-прапагандысцкай працы сярод насельніцтва БССР. Выстава павінна была прадэманстраваць трыумф маладой беларускай дзяржавы [19, арк. 37–38].

Усебеларуская сельскагаспадарчая выстава ў Мінску адбывалася 10 жніўня – 1 лістапада 1930 г. Дзяржаўная экспартна-імпартная кантора Упраўлення НКЗГ РСФСР пры СНК БССР паведамляла ў Гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Польшчы у красавіку 1930 г. у сувязі з падрыхтоўкай Усебеларускай сельскагаспадарчай выставы у Мінску аб неабходнасці дасылкі тэхнічнай і каталожнай літаратуры аб польскай прамысловасці (даведнікі, навейшыя каталогі) [11, арк. 26].

*Заключэнне.* Такім чынам выставачна-кірмашовая дзейнасць Упраўлення ўпаўнаважанага НКЗГ РСФСР (СССР) пры СНК БССР садзейнічала ўмацаванню беларускіх эканамічных пазіцый, была спосабам азнаямлення шырокіх слаёў насельніцтва з новымі таварамі і паслугамі, забяспечвала збыт прадукцыі на мясцовым і замежных рынках шляхам заключэння дагавораў. Удзел беларускіх прадстаўнікоў у працы шматлікіх міжнародных кірмашоў (Ліонскі, «Усходнія таргі» ў Львове, «Заходнія таргі» ў Познані, Ніжагародскі) і выставах (Усерасійская сельскагаспадарчая і кустарна-прамысловая, Усебеларуская сельскагаспадарчая) садзейнічалі павелічэнню аб'ёму экспартна-імпартных аперацый, умацоўвалі міжнародны аўтарытэт маладой савецкай рэспублікі.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Адамайтис, И.* Наш экспорт и внешний рынок (По материалам заграничной командировки) / И. Адамайтис // Савецкае будаўніцтва. – 1928. – № 5. – С. 2–5.
2. *Теумин, И.* Объединение Западной области с точки зрения внешней торговли / И. Теумин // Народное хозяйство Белоруссии. – 1922. – № 2–3. – С. 42–47.
3. Внешняя торговля Белоруссии в 1923–1924 хоз. году: Очерк деятельности Управления уполномоченного Наркомвнешторга при СНК БССР и Государственной экспортно-импортной конторы «Госторгбел». – Минск, 1925. – 74 с.
4. *Кравченко, П. К.* Экономические и культурные связи БССР с зарубежными странами (1921–1932 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук / П. К. Кравченко. – Минск, 1976. – 31 с.
5. *Барынкин, А. В.* Польша во внешнеполитической стратегии Советской России (1918–1919 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.15 / А. В. Барыкин. – Санкт-Петербург, 2013. – 54 с.
6. *Романовский, Д. В.* Внешнеэкономические связи БССР с зарубежными странами (на примере работы Госторгбела в 1922–1931 гг.) : дис. ... канд. ист. наук / Д. В. Романовский. – Минск, 2003. – 37 с.
7. Документы внешней политики СССР : в 24 т. / редкол.: Г. А. Белов [и др.]. – М., 1959. – Т. 3 : 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. – 723 с.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 126. Воп. 1. Спр. 2.
9. НАРБ. – Ф. 492. Воп. 1. Спр. 242.
10. Targi Wschodnie: rozwoj i perspectywy. – Lwow, 1921. – 27 s.
11. НАРБ. – Ф. 492. Воп. 1. Спр. 238.
12. НАРБ. – Ф. 126. Воп. 1. Спр. 53.


*References*


1. *Adamajtis, I.* Nash eksport i vneshnij rynok (Po materialam zagranichnoj komandirovki) / I. Adamajtis // Saveckae budaŭnictva. – 1928. – № 5. – S. 2–5.
2. *Teumin, I.* Ob"edinenie Zapadnoj oblasti s tochki zreniya vneshnej torgovli / I. Teumin // Narodnoe hozyajstvo Belorussii. – 1922. – № 2–3. – S. 42–47.
3. Vneshnyaya torgovlya Belorussii v 1923–1924 hoz. godu: Ocherk deyatel'nosti Upravleniya upolnomochennogo Narkomvneshtorga pri SNK BSSR i Gosudarstvennoj eksportno-importnoj kontory «Gostorgbel». – Minsk, 1925. – 74 s.
4. *Kravchenko, P. K.* Ekonomicheskie i kul'turnye svyazi BSSR s zarubezhnymi stranami (1921–1932 gg.) : avtoref. dis. ... kand. ist. nauk / P. K. Kravchenko. – Minsk, 1976. – 31 s.
5. *Barynkin, A. V.* Pol'sha vo vneshnepoliticheskoj strategii Sovetskoj Rossii (1918–1919 gg.) : avtoref. dis. ... kand. ist. nauk : 07.00.15 / A. V. Barykin. – Sankt-Peterburg, 2013. – 54 s.
6. *Romanovskij, D. V.* Vneshneekonomicheskie svyazi BSSR s zarubezhnymi stranami (na primere raboty Gostorgbela v 1922–1931 gg.) : dis. ... kand. ist. nauk / D. V. Romanovskij. – Minsk, 2003. – 37 s.
7. Dokumenty vneshnej politiki SSSR : v 24 t. / redkol.: G. A. Belov [i dr.]. – M., 1959. – T. 3 : 1 iyulya 1920 g. – 18 marta 1921 g. – 723 s.
8. Nacyyanal'ny arhiŭ Respubliki Belarus' (NARB). – F. 126. Vop. 1. Spr. 2.
9. NARB. – F. 492. Vop. 1. Spr. 242.
10. Targi Wschodnie: rozwoj i perspectywy. – Lwow, 1921. – 27 s.
11. NARB. – F. 492. Vop. 1. Spr. 238.
12. NARB. – F. 126. Vop. 1. Spr. 53.

13. Всероссийская сельскохозяйственная и кустарно-промышленная выставка с иностранным отделом. Материалы и документы. – М., 1923. – 67 с.
14. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 11 т. / под ред. С. Вроньского. – М., 1965. – Т. 4 : апрель 1921 г. – май 1926 г. – 560 с.
15. АЗП РФ. – Ф. 04. Воп. 32. Папка 212. Спр. 62567.
16. РДАСПГ. – Ф. 17. Воп. 163. Спр. 331.
17. Документы внешней политики СССР : в 24 т. / редкол.: Г. А. Белов [и др.]. – М., – Т. 6: 20 ноября 1922 г. – 31 декабря 1923 г. – М. : Госполитиздат, 1962. – 646 с.
18. НАРБ. – Ф. 492. Воп. 1. Спр. 174.
19. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1277.

13. Vserossijskaya sel'skohozyajstvennaya i kustarno-promyshlennaya vystavka s inostrannym otdelom. Materialy i dokumenty. – M., 1923. – 67 s.
14. Dokumenty i materialy po istorii sovetsko-pol'skih otnoshenij : v 11 t. / pod red. S. Vron'skogo. – M., 1965. – T. 4 : aprel' 1921 g. – maj 1926 g. – 560 s.
15. AZP RF. – F. 04. Vop. 32. Papka 212. Spr. 62567.
16. RDASPG. – F. 17. Vop. 163. Spr. 331.
17. Dokumenty vneshnej politiki SSSR : v 24 t. / redkol.: G. A. Belov [i dr.]. – M., – T. 6: 20 noyabrya 1922 g. – 31 dekabrya 1923 g. – M. : Gospolitizdat, 1962. – 646 s.
18. NARB. – F. 492. Vop. 1. Spr. 174.
19. NARB. – F. 6. Vop. 1. Spr. 1277.